УДК 141.311. 2(476)”18”

# АДЛЮСТРАВАННЕ САЦЫЯКУЛЬТУРНАГА КАНЦЭПТА “ПРАЎДА” Ў БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX ст.

***Ульяна Жылко***
*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Гродна, Беларусь*

У дадзеным артыкуле робіцца спроба вызначыць змест і сутнасныя прыкметы сацыякультурнага канцэпта “праўда” ў айчыннай мастацкай культуры XIX ст. (на матэрыяле твораў літаратуры). Падкрэсліваецца, што канцэпт з'яўляецца шматмерным сэнсавым утварэннем і ўваходзіць у канцэптасферу нацыянальнай культуры. Робіцца акцэнт на выяўленні сэнсавага напаўнення канцэпта “праўда” і яго варыяцыі “мужыцкая праўда”. Гэта даследаванне з'яўляецца ўнёскам у выяўленне культуралагічных аспектаў канцэптасферы беларускай культуры

***Ключавыя словы: сацыякультурны канцэпт “праўда”, “мужыцкая праўда”, нацыянальная канцэптасфера, беларуская культура другой паловы XIX ст***

Другая палова XIX ст. у айчыннай культуры была адметная пераходам да крытычнага праўдзівага пераасэнсавання і адпаведна адлюстравання рэчаіснасці, а таксама працягам распачатага рамантызмам бунту супраць несправядлівасці. У сярэдзіне стагоддзя рамантызм паступова сінтэзуецца з рэалістычнымі тэндэнцыямі, што праявілася найперш у мастацкай культуры. Дадзеная сацыякультурнай дынаміка абумовіла выяўленне ў творчасці суб’ектаў мастацкай культуры сацыякультурнага канцэпта “праўда” і “мужыцкая праўда” як аднаго з вызначальных.

Канцэпт – асноўная адзінка культуры ў ментальным свеце чалавека. У канцэптасферы кожнага народа ёсць мноства канцэптаў, якія маюць яркую нацыянальную спецыфіку. Многія з гэтых канцэптаў «кіруюць» успрыманнем рэчаіснасці, разуменнем з'яў і падзей, якія адбываюцца, абумоўліваюць нацыянальныя асаблівасці паводзін народа. Для правільнага разумення думак і паводзін народа выяўленне і апісанне зместу такіх канцэптаў з'яўляецца выключна важным [7].

Канцэпт варта разумець як “адзінку калектыўных ведаў (якая адпраўляе да найвышэйшых духоўных сутнасцей), мае моўнае выражэнне і пазначана этнакультурнай спецыфікай” [2, с. 51–52]. Вывучыўшы і падагульняючы існуючыя на сённяшні дзень падыходы да разумення прыроды канцэпта, найбольш прадуктыўным мы мяркуем

кагнітыўны падыход, згодна з якім канцэпт ёсць комплексная мысліцельная адзінка, якая адлюстроўвае культурна-гістарычны вопыт народа і яго светаўспрыманне.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца выяўленне семантычнай напоўненасці сацыякультурнага канцэпта "праўда" на аснове творчай спадчыны суб'ектаў беларускай культуры XIX ст.

Змены сацыякультурнай парадыгмы былі абумоўлены некаторымі зменамі ў сацыяльным і палітычным жыцці. 50–60-я гг. XIX ст. – час найвышэйшага ўздыму вызваленчай барацьбы беларусаў супраць царызму, што ў культурфіласофскай тэорыі атрымала назву "вызвалення народаў". У сферы сацыльна-палітычных адносін захоўваецца панаванне расійскага самадзяржаўя. Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. адбываецца ўзмацненне рэпрэсіўнага рэжыму, што выявілася ва ўзмацненні паліцэйска-бюракратычнага кантролю за палітычным жыццём на тэрыторыі Беларусі, паглыбленні палітыкі русіфікацыі ў розных сферах грамадскага жыцця.

Менавіта ў дадзеных супярэчлівых гістарычных абставінах выспела патрэба ў максімальна рэалістычным адлюстраванні рэчаіснасці на аснове яе выкрывальнай крытыкі з пазіцыі рэвалюцыйна-дэмакратычнай ідэалогіі, неабходнасці засяроджвання ўвагі на сацыяльных праблемах. "*Душы век паразгневаў – ні малітваў, ні спеваў, / век рэальнасць шануе"* [5, с. 82]. Станаўленне рэалістычнага накірунку ў мастацтве суправаджаецца актуалізацыяй сацыяльна-дэмакратычнай праблематыкі ў Еўропе і адпаведна прыводзіць да станаўлення дадзенай парадыгмы і ў межах беларускага культурнага поля – дэмакратычная матывацыя ў арганізацыі нацыянальна-вызваленчага руху. Таму сацыякультурную парадыгму другой паловы XIX ст. варта абазначыць у адпаведнасці з дамінуючай ідэалогіяй як *рэалістычна-дэмакратычную*, паколькі крытычны рэалізм сам па сабе не выйшаў за межы мастацтва, не вызначаў адметнасць і развіццё грамадскага і сацыяльнага жыцця, што было ўласціва папярэднім стылістычным накірункам як асноўным сродкам адлюстравання сацыякультурных парадыгмаў.

Творчасць суб'ектаў дэмакратычна-рэалістычнай парадыгмы сацыякультурнага развіцця грамадства XIX ст. накіравана на праўдзівае адлюстраванне сацыякультурнага кантэксту, дзякуючы чаму інтэрпрэтацыя дамінуючых грамадскіх ідэалаў у межах дадзенай парадыгмы пераважна адбываецца праз кантраст ўяўлення ідэалаў і апісаных момантаў сацыяльнай несправядлівасці. Ідэал у беларускай культуры XIX ст. "не выносіцца за межы чалавечага свету, а вырастае з рэальнага жыцця" [6, с. 49]. У межах светапоглядавага складніка рэалістычна-дэмакратычнай парадыгмы можна вылучыць імкненне да ўзнаўлення жыццёвай праўды, якая паказвае пэўную неадпаведнасць тагачаснага грамадскага ладу нормам чалавечнасці, гуманістычнай маралі. В. Каратынскі лічыў, што крыніцай мастацтва з'яўляецца грамадскае жыццё, а суб'ект культуры (творца, мастак) праз інтэрпрэтацыю сацыякультурнай сітуацыі павінен рэфлексаваць у адпаведнасці з грамадскімі думкамі, пачуццямі, ідэаламі і ўвасабляць іх у сваіх творах.

Перад тагачаснымі суб'ектамі культуры стала задача даследаваць жыццё з мэтай выяўлення ў ім аб'ектыўных прычынна-выніковых сувязей. Таму змена рамантычнай парадыгмы на рэалістычна-дэмакратычную ў беларускай духоўнай культуры была цалкам заканамернай. Агульная эмоцыя ў межах светапоглядавага складніка дэмакратычна-рэалістычнай парадыгмы XIX ст. ахоплівае стан ад шчымлівага шкадавання народа, абмежаванага ў свабодзе, туга ад немагчымасці дасягнення ідэальнага жыцця ў шчасці ў рэальнасці да максімальнага абурэння ад убачанага і радыкальнага бунту супраць несправядлівасці. У дадзенай інтэнцыі бачыцца спрадвечнае процістаянне праўды і крыўды ў народный свядомасці, калі пяройдзена мяжа цярплівасці. Прычым удзельнік вечнай спрэчкі з крыўдай застаецца, як правіла, у меншасці, але, тым не менш, імкненне прамаўлення праўды ёсць першы крок да яе пражывання.

На светапоглядавым узроўні дэмакратычна-рэалістычнай парадыгмы дамінуе праблематыка *вызвалення і сацыяльнай роўнасці*. У той жа час адметнай уяўляецца ўвага да сацыяльнай кансалідацыі ў імкненні да вызвалення з-пад прыгнёту (як сацыяльнага, так і дзяржаўнага), што стварае ўмовы для развіцця не адной сацыяльнай праблематыкі, а *антыкаланіяльнай, антыімперскай рэфлексіі* (К. Каліноўскі, Ф. Багушэвіч), якая вызначылася дакладным акрэсліваннем ворага і праўдзівым адлюстраваннем асноўнага

матыву змагання. Той жа посткаланіяльны вектар абумовіў канчатковае вылучэнне ў культурнай прасторы беларускай нацыянальнай культуры і традыцыі, а таксама вербальнае афармленне нацыянальнай ідэі, выяўленае ў творчасці Ф. Багушэвіча.

У беларускай сацыякультурнай сітуацыі XIX ст. у межах рэалістычнай парадыгмы адным з актуальных быў матыў праўдашукальніцтва – пошукаў і сцверджання сваёй, народнай праўды. Не прыходзіцца спрачацца з тым, што практычна ўсе сферы чалавечай жыццядзейнасці ў большай ці меншай ступені спалучаныя з феноменам праўды. Свет чалавечы здаўна быў недасканалым, таму людзі заўсёды шукалі праўду, ісціну, справядлівасць. У аснове дадзенага матыву палягае катэгорыя праўды, пад якой варта разумець рэальны парадак рэчаў, адпаведнасць вядомага наяўнаму. Праўда з'яўляецца адной з фундаментальных экзістэнцыйных каштоўнасцей. Канцэпт «праўда» - значны для беларускай культуры XIX ст.

Найперш асаблівасці ўвасаблення дадзенага канцэпта ў мастацкай творчасці былі звязаны з асаблівасцямі ўсведамлення рэчаіснасці. Асноўную ўстаноўку суб’екты рэалістычна-дэмакратычнай парадыгмы бачылі ў тым, каб не капіраваць рэчаіснасць, а выражаць яе. Спецыфіка і сіла рэалізму ў тым, каб пераадольваць суб’ектывізм у імя праўды. Слушна зазначыў В. Каратынскі: *“Высакародная мэта – праўдзівая, а што праўдзівае, тое прыгожае ў мастацкім сэнсе, значыць, можа быць прадметам мастацтва. <...> Мастацтва павінна быць праўдай, павінна змагацца за справу вечна жывой праўды, бо ў адваротным выпадку, як з’ява без мэты ці з часовай мэтай, яна зробіцца абыякавай для грамадства* [4, с. 148–149]”.

Канцэпт “праўда” і яго варыяцыя “мужыцкая праўда” знайшлі сваё адлюстраванне ў парадыгмальных тэкстах. Найбольш паслядоўна сацыякультурная парадыгма раскрываецца ў творчасці Ф. Багушэвіча, у якой амаль упершыню загучалі не толькі сацыяльныя матывы (рэфлексія на абумоўленасць індывідуальнага лёсу сацыяльным становішчам прыгоннага селяніна), але і матывы нацыянальнага адраджэння (здольнасць узняцця над сітуацыяй і перспектывай змагання). Творчыя прынцыпы Ф. Багушэвіча развівалі і дапаўнялі яго сучаснікі і паслядоўнікі А. Гурыновіч, Я. Лучына (у творах паэта ўзаемадзейнічаюць рэалістычныя і рамантычныя светапоглядавыя і ідэйныя пачаткі). Рэалістычныя тэндэнцыі прасочваюцца ў некаторых творах В. Каратынскага, А. Ельскага, Ф. Тапчэўскага.

Звярнуўшыся да рэалістычнага адлюстравання рэчаіснасці на пэўным этапе сваёй творчай дзейнасці, В. Каратынскі ў паэме “Таміла” адлюстраваў дадзеную парадыгмальную адметнасць праз трагедыю лёсу селяніна Тамілы, які, маючы чулую і эстэтычна распрацаваную душу, вымушаны пакутаваць праз сваё сацыяльнае становішча, паколькі нават неверагодная воля да жыцця, якая з’яўляецца адной з вызначальных рысаў народнага характару беларуса, не прыносіць паратунку. Менавіта праз падкрэсленую адлюстраваную трагічнасць аўтарскія інтэнцыі накіраваны на імкненне да ідэалаў свабоды і роўнасці – вызваленне простага чалавека з-пад прыгону, наданне яму роўных правоў з іншымі людзьмі на аснове аспектаў прыроджанай роўнасці. Відавочна, што менавіта рэалістычны светапогляд прынёс у культуру неабходнасць пераасэнсавання сацыяльнай роўнасці ў якасці дамінуючага грамадскага ідэала. Ізноў жа, таго патрабаваў час, паколькі ўдзел суб'ектаў культуратворчасці ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе, іх імкненне падтрымаць селяніна ў яго правах, і адначасова чаканне падтрымкі ад яго ў барацьбе супраць акупанта – заканамерныя тэндэнцыі эпохі.

У народнай канцэптасферы праўда можа быць агульная як нейкая універсальная катэгорыя, але ў XIX ст. вылучаецца сацыякультурны канцэпт “мужыцкая праўда”, якая належыць канкрэтнаму суб'екту – народу. Празда суб'ектна-арыентаваная – гэта, перш за ўсё, праўда-справядлівасць, а праўда агульная з'яўляецца пераважна праўдай-ісцінай. Праўда, якая належыць канкрэтнаму суб'екту, можа быць падзелена на праўду сваю і праўду чужую. Трэба адзначыць, што гэта не проста падзел, а нейкае проціпастаўленне: свая праўда – гэта і праўда, і справядлівасць, а чужая праўда – гэта ні тое, ні другое, гэта няпраўда. У творчасці суб’ектаў беларускай культуры XIX ст. сэнсавае напаўненне канцэпта праўды прасочваецца на розных узроўнях.

Репозиторий ПолесГУ

Праўда народнай справядлівасці (“мужыцкая праўда”) выступае ў якасці ідэацыйнага канцэпта [6, с. 156] і дамінуючага ідэала ў творчасці К. Каліноўскага. Непасрэдным доказам таго выступае аўтарская рэфлексія наконт неаспрэчнасці першаступеннасці праўды перад іншымі вышэйшымі аксіялагічнымі катэгорыямі, у якасці якіх выступае Бог і асабістае шчасце: “*Калі за нашу праўду Бог нас стаў караці / Дай у прадвечнага саду вялеў прападаці, / то мы прападзем марна, но праўды не кінем, / Хутчэй Неба і шчасце, як праўду абмінем”* [3, с. 37]. Такім чынам, відавочным выступае размеркаванне прыярытэтаў: праўда і яе спасціжэнне пераўзыходзіць па значнасці нават гарантаванасць боскага выратавання і зямное шчасце.

“Мужыцкая праўда” выступае ў якасці сацыякультурнага канцэпта, насычанага духоўным і сацыяльным зместам. Калі разглядаць дадзеную катэгорыю як грамадскі ідэал, відавочна, што яна спалучае ў сабе поруч з аксіялагемай *праўды* адсылку да сацыяльнай групы – прадстаўнікоў народа, у межах якой сканцэнтравана імкненне да дасягнення дадзенага ідэала. Для жыццёвай праўды і справядлівасці як грамадскіх ідэалаў у якасці неаспрэчнага арыенціра выступае вышэйшы хрысціянскі ідэал – Божая праўда, што выдатна ўсведамлялі суб’екты мастацкай творчасці, якія, абапіраючыся на народную мараль, заклікалі чалавека і грамадства жыць па-боску, сумленна. У народным светапоглядзе праўда стаіць вышэй за ўсё, яна ўспрымаецца як найвялікшая каштоўнасць, ёй надаецца выключнае значэнне, як набытым ведам, што даюць магчымасць сфармуляваць уласнае стаўленне да аб’ектыўнай рэчаіснасці, пачуццёва спасцігнуць яе сэнс.

Сапраўды, у беларускай літаратуры заўсёды знаходзіліся тыя, хто меў мужнасць гаварыць і адстойваць праўду, імкнуўся знайсці выйсце з цяжкага становішча, не пагаджаўся з хлуснёй, кідаў выклік часу і абставінам, заклікаў пазбавіцца пачуцця рабскай пакоры і страху. Адным з такіх па-грамадзянску мужных людзей і праўдалюбаў быў пісьменнік Ф. Багушэвіч. Праўду вызнае аўтар за першаступенны ідэал, які здольны абудзіць грамадства і выратаваць ад несправядлівасці: “*Каб яго, то слова, ды праўдай назвалі, / Каб і разышлося то слова па свеце <…> / Каб жа тое слова ды людцаў з’яднала, / Каб на тое слова варагоў не стала; / Каб людцы прызналі братоў ды братамі – / Дзяліліся б доляй і хлеба шматамі, / А без таго слова я – нямы калека!”* [1, с. 34]. Ф. Багушэвіч у сваіх думках і разважаннях скіроўваўся да пошуку вышэйшай праўды – Божай – для народа і ўсёй зямлі Беларусі: “*Да пашлі ж ты, Божа, Праўду сваю тую / З неба на зямельку, слязьмі залітую! <…> Пашлі ж цяпер духа, да пашлі без цела, / Каб уся зямелька адну праўду мела”* [1, с. 35]. Менавіта праўда стаяла на чале нацыянальнага самаўсведамлення ды выкрышталізоўвання нацыянальнай ідэі, паколькі на аснове праўды не толькі спасцігаецца сапраўдная сутнасць рэчаў і з’яў як ў сінхранічным, так і ў дыяхранічным планах, але і прадпрымаюцца спробы карэкціроўкі рэальнасці на аснове азначанага ідэала.

У прадстаўніку народа суб’екты дэмакратычна-рэалістычнай парадыгмы бачылі носьбіта сумарнага вопыту ўсёй грамады, які, нягледзячы на звыродлівасць умоў існавання, здолеў захаваць у сабе спрадвечную мудрасць, асабістую годнасць і волю да жыцця. Народу як суб’екту культуры ўласціва неверагодная воля да жыцця: выжыць пры любых абставінах, нават самых жорсткіх, захаваўшы пры гэтым сваю годнасць, кіруючыся прынцыпам людскасці (паступаць па-людску пры любых абставінах): “*Ды хоць няма хлеба, жабраваць не буду / Пражыву як-кольвек ад працы, ад труду”* [1, с. 33]. І ў гэтым ужо бачыцца своеасаблівае негвалтоўнае змаганне з існуючай сістэмай за ідэал свабоды ва ўмовах яе абмежавання: праз пераадоленне і вытрымку нягодаў, цяжкую, але сумленную працу, трагізм свайго бяспраўнага становішча селянін загартоўвае душу і мацуецца ў гераічнасці праз перанесеныя пакуты, захоўваючы спрадвечную мараль (людскасць) і ўласную годнасць, арыентуючыся на боскія ідэалы дапамогі бліжняму і распрацоўваючы душу ў сузіранні прыроднай вітальнасці і хараства.

Ф. Багушэвіч не толькі падтрымлівае праблему сацыяльнай справядлівасці, якая пераважала тады ў грамадскай думцы – ён імкнецца актыўна зацвердзіць ідэю ўсеагульнай справядлівасці, адзінства і братэрства: “уся зямелька бы адну праўду мела”, “людцы прызналі братоў ды братамі”. У яго разуменні ідэала справядлівасці, ісціны ды



Репозиторий ПолесГУ

праўды вядучым выступае сацыяльны момант, які непасрэдна вызначае агульначалавечы, маральны. Але рэальныя шляхі ўсведамлення народам свайго становішча і сваіх патрэб з наступнымі дзеяннямі яму невядомыя. У пазіцыі Ф. Багушэвіча вельмі прыкметны элементы светапоглядавага ўзроуня асветніцкай сацыякультурнай парадыгмы, прасочваецца падкрэсліванне ролі інтэлігенцыі ў вырашэнні пытання рэалізацыі ідэала ў рэчаіснасці: "*От, здаецца б і не еўшы / Быў бы сыты на свабодзе / Як той кролік ў гародзе / Тут, здаецца б, і сканаў бы, / За свабоду жыццё даў бы"* [1, с. 61].

Ф. Багушэвіч праз адлюстраванне крайняга ўзроўня сацыяльнай несправядлівасці (выражана ў такіх канцэптуальных схемах з сацыяльным падтэкстам, як "Кепска будзе!", "Бог не роўна дзеле" – У. Ж.) не толькі крытыкаваў сацыякультурную сітуацыю таго часу, ён меў на мэце матываваць селяніна да дзеяння, тым самым пераўтварыць энергію пакут у энергію актыўнага супраціву ў імкненні да свабоды (вызвалення сацыяльнага, маральнага, самавызначэння супольнага і асабістага).

Творчыя суб'екты рэалістычна-дэмакратычнай парадыгмы сцвярджалі, што шчасце чалавека магчыма толькі тады, калі будзе свабодным увесь народ. У іх інтэрпрэтацыі сацыяльна-палітычны ідэал свабоды заключаецца ў супольнай тэндэнцыі змагання за вызваленне не толькі селяніна з-пад прыгону, але і краіны з-пад акупацыі імперыі. У беларускім сэнсе імкненне да свабоды ёсць імкненне бараніць "сваю праўду" і "сваіх" як членаў адной грамады.

Ф. Багушэвіч праз адлюстраванне крайняга ўзроўня сацыяльнай несправядлівасці не толькі рэфлексаваў на сацыякультурную сітуацыю таго часу, ён меў на мэце праз ілюстрацыю горкага вопыту селяніна пад прыгонам матываваць яго да дзеяння, тым самым пераўтварыць "энергію пакут ў энергію актыўнай барацьбы". Селянін, якога абдзяляюць пры скасаванні прыгону, крыўдзяць суд і царскія чыноўнікі, абдзірае казна, але ён не скараецца, захоўвае чалавечую годнасць і гонар, нягледзячы на часта празмерна заніжаную наіўнасць у спасціжэнні свету. Праз рэпрэзентацыю ўбогіх прыземленых малюнкаў сялянскага жыцця аўтарская рэфлексія інтэрпрэтуецца двухсэнсоўна: аўтар мае на мэце не толькі падкрэслена выклікаць шкадаванне ад сузірання бядотнага становішча, але і абудзіць селяніна, каб ён паглядзеў на сваё жыццё з боку.

Поруч з канцэптам праўды неад'емна злучаным выступае канцэпт свабоды або *волі*, якая для беларусаў азначала не толькі свабоду, але і рашучасць у волевыяўленні. У творчасці К. Каліноўскага атрымаў наступную інтэрпрэтацыю: *"Мы сягодня ўсе ўжэ ведаем, што чалавек вольны, гэта калі мае кусок сваей зямлі, – калі не ідзе ў рэкруты чорт ведае гдзе, а ідзе бараніці свайго краю тагды толька, калі які непрыяцель надыдзе, – калі робіць усенька, што спадабае і што не крыўдзіць бліжняга і хвалы боска, – і калі вызнае тую веру, якую вызнавалі яго бацькі, дзяды, прадзеды. От што вольнасць значыць"* [3, с. 25]. Культуралагічны дыскурс мастацка-публіцыстычнай спадчыны К. Каліноўскага дэманструе гарманічнае спалучэнне абстрактных тэарэтычных уяўленняў аб свабодзе і канкрэтных, даступных разуменню простага чалавека яго змястоўных параметраў, якія носяць каштоўнасны характар і разглядаюцца ў межах народнай аксіялогіі: роўнасць усіх людзей перад Богам, свая зямля як гарант свабоды, свая "справядлівая" (уніяцтва), а не чужая, навязаная вера і звязаныя з ёй маральныя пастулаты, сацыяльная справядлівасць і патрыятызм, выражаны ў гатоўнасці служэння Айчыне і абароны яе ў выпадку небяспекі.

На той час былі надзвычай сумнеўнымі дзяржаўныя прапановы вызвалення з-пад прыгону сялян, што не магло не адбіцца на відавочным разыходжанні паміж законам і рэальнай сітуацыяй і адпаведна на поглядах абодвух бакоў на сялянскае пытанне: "*Не надта свабодна ў гэтай свабодзе"* [1, с. 67]. Супастаўляючы сялянскае разуменне вольнасці і царска-памешчыцкай волі, якую дала рэформа 1861 г., К. Каліноўскі падкрэсліваў, што мужыцкая вольнасць, абазнанасць у сваіх справялівых правах – гэта ўсё роўна што "шыбеніца для ўсіх здзерцаў і глуміцеляў".

Інтэнцыйнае канструяванне, якое складае аснову ідэалатворчасці ў межах дэмакратычна-рэалістычнай парадыгмы, найперш праектуе ідэал свабоды на ўзроўні падсвядомасці і суадносіць яго з рэальнасцю сацыяльнага быцця. Так, у змаганні за ідэал свабоды К. Каліноўскі відавочна апазіцыйна настроены ў адносінах да дэспатыі і да яе

канкрэтна-гістарычнай формы – расейскага самадзяржаўя, імперыі-ворага. Ён стаіць на пазіцыі таго, што грамадская супольнасць мусіць згуртавацца і дзейнічаць у адпаведнасці з адзінай праграмай, якая б вызначала паводзіны кожнага ў справе дасягнення агульнай мэты: “*Бо каб мужыкі ўсе разам былі збунтаваліся і ўхапілі за сакеры, нажы і косы, так бы маскаль мусіў бы прапасці без паўстаня і мы на век вякаў ужэ былі бы вольны”* [3, с. 23–24]. Грамадскі ідэал адносна дзяржаўнага будаўніцтва, фарміравання гарманічнай дзяржавы К. Каліноўскі тлумачыў так: *“...добры ўрад глядзець павінен шчасця людзей, слухаць народ і рабіць так, як народаві лепей. І не дзіва, бо не народ зроблены для ронду, а ронд для народа*” [3, с. 26].

Ідэал сацыяльнай кансалідацыі, народнага яднання для дасягнення галоўнай мэты – свабоды, адлюстраваны ў рэфлексіўна-публіцыстычнай творчасці К. Каліноўскага, выступае як вектар, задаючы накірунак неабходных сацыяльных зменаў: “*Но не доўга яны нас будуць абдзіраці, бо мы пазналі, гдзе сіла і праўда, і будзем ведаць, як рабіць трэба, каб дастаць зямлю і свабоду. Вазьмемся, дзецюкі, за рукі і дзяржэмся разам!”* [3, с. 22] “*За мужыцкую крыўду стойце смела, усе разам. Падумайце добра, да, памаліўшыся Богу, станьма дружна разам за нашую вольнасць!”* [3, с. 32] Так К. Каліноўскі шляхам супастаўлення несправядлівасці тагачасных сацыяльных адносін выявіў значную інтэнцыю выразнай неабходнасці змагання з расійскай і панскай тыраніяй, патрэбу актыўнага сацыяльнага дзеяння народа.

Абапіраючыся на папарэдні аналіз, можна сказаць, што сярод вызначальных катэгорый нацыянальнай канцэптасферы ў разглядаемы перыяд найбольш вылучаецца сацыякультурны канцэпт праўда, які выступае рэтранслятарам нацыянальнай культуры XIX ст., вызначае шкалу каштоўнасцей, светапоглядныя адметнасці народа, выконвае вялікую ролю ў адлюстраванні нацыянальнай канцэптасферы. З яго дапамогай выражаюцца паняцці, якім надаецца асаблівая ўвага ў дадзены перыяд: свабода, воля, справядлівасць, змаганне. Сэнсавае напаўненне канцэпта “праўда” ў творчай спадчыне суб’ектаў беларускай культуры XIX ст. можна ўявіць наступным чынам:

– праўда – тое, што адпавядае рэчаіснасці,  што ёсць на самой справе, ісціна – як аснова рэалістычна-дэмакратычнай сацыякультурнай парадыгмы;
– праўда – справядлівасць, сумленнасць; парадак, заснаваны на справядлівасці;
– спосаб жыцця, заснаваны на адпаведнасці учынкаў патрабаванням народнай маралі, абавязку;
– тое, за што можна моцна пацярпець (доказам таго выступаюць сюжэты Ф.Багушэвіча, В.Каратынскага, а таксама трагічна-гераічны лёс К.Каліноўскага і паплечнікаў);
– “свая” народная “мужыцкая” праўда вылучаецца з праўды ўніверсальнай, паколькі мае на мэце сцверджанне народа як самастойнага суб’екта гісторыка-культурнага працэса.

Такім чынам, з вышэйсказанага бачна, што семантычнае напаўненне канцэпта “праўда” даволі разнастайнае. У межах дадзенага канцэпта апынуліся іншыя складнікі нацыянальнай канцэптасферы, якія ў XIX ст. найбольш вылучаюцца як самыя істотныя для нацыянальнай культуры на стадыі яе фарміравання: народ, свабода, воля, роўнасць, сацыяльная кансалідацыя, змаганне з несправядлівасцю. Найбольш істотныя для нашай культуры сэнсавыя значэнні, выкарыстаныя суб’ектамі культуратворчасці другой паловы XIX ст., падтрымліваюцца і захоўваюцца ў нацыянальнай карціне свету.


1. Багушэвіч, Ф. Творы / Ф. Багушэвіч. – Мн. : Маст. літ., 2001. – 206 с.
2. Воркачев, С. Г. Счастье как лингвокультурный концепт / С. Г. Воркачев // Москва : ИТДГК “Гнозис”, 2004. - 236 с.
3. Каліноўскі, К. Мужыцкая праўда / К. Каліноўскі // Тварам да шыбеніцы: Кастусь Каліноўскі і Паўстанне 1863–1864 гг. у беларускай і летувіскай паэзіі : анталогія. – Ракаў : Янушкевіч, 2013. – С. 21–33.
4. Каратынскі, В. Творы / В. Каратынскі. – Мн. : Маст. літ., 2009. – 334 с.
5. Лучына, Я. Творы: вершы, нарысы, пераклады, лісты / Я. Лучына. – Мн. : Маст. літ., 2001. – 206 с.
6. Рагуля, А. У. Зерне харавства : культурфіласофскія нататкі / А. У. Рагуля. – Мн. : Выд. В. Хурсік, 2013. – 272 с.


Репозиторий ПолесГУ

7. Стернин, И. А. Коммуникативное и когнитивное сознание [Электронный ресурс] / И. А. Стернин. – Режим доступа: www.comch.ru/~rpr/sternin/ articlesrus.html. – Дата доступа: 2.12.2019.

## THE EMBODIMENT OF THE SOCIOCULTURAL CONCEPT OF "TRUTH" IN THE BELARUSSIAN CULTURE OF THE SECOND PART OF THE XIX-TH CENTURY

***Ulyana A. Zhylko***
*PhD, Grodno State Kupala University, Grodno, Belarus*
uliana915@mail.ru

Репозиторий Полесгу

**Summary:** This article attempts to define the content of the socio-cultural concept of "truth" in the Belorussian artistic culture of the XIX century. The author emphasizes the concept is a multidimensional and semantic form as the part of the national conceptual sphere. Using the cultural understanding of the concept it is noted the identification of the semantic content of the concept of "truth". This study is a contribution to the development of the culturological aspects of the concepts of the Belarusian national culture

***Keywords: socio-cultural concept of "truth", national conceptual sphere, Belarusian culture in the second half of the XIX-th century***